**П. Лабкоўская**

# АПОШНІ ПРЫТУЛАК ТАДЭВУША РЭЙТАНА

Спадчына, якая нам дасталася ад продкаў, цікавая і багатая. Паважлівае стаўленне да роднага краю, свайго народа і яго культуры – найвялікшая каштоўнасць для любой нацыі. Гісторыя роднай краіны – гэта найважнейшая частка спадчыны, якая спрыяе фарміраванню нацыянальнай свядомасці пакаленняў. Мэта дадзенага даследавання арыентавана на распрацоўку канкрэтнага аспекту: ацаніць важнасць захавання і адраджэння страчанай духоўнай і матэрыяльнай культуры.

Заслугоўваюць увагі даследаванні пра сядзібны комплекс ў Грушаўцы Р. Афтаназы, А. Т. Федарука, Л. М. Несцярчука, С. В. Чарановіча. Вёска Грушаўка ўпамінаецца з XVI ст. Яна мела розных уладальнікаў: Барбара Радзівіл, Міхаіл Залескі, П. Шлягер, Рэйтаны. Так, 20 жніўня 1742 г. у фальварку Грушаўка нарадзіўся Тадэвуш Рэйтан, які стаў гістарычнай асобай, а яго маёнтак быў лепшым сярод маёнткаў магнатаў таго часу. Вось што значыцца ў энцыклапедыі: «Тадэвуш Рэйтан, як пасол ад Навагрудскай зямлі на сейме, які праходзіў у Гародне ў 1773 г., уславіўся нязломным напорам супраць падзелу Рэчы Паспалітай». Рэйтан ніколі так і не змірыўся з падзелам і апошнія гады жыцця правёў у Грушаўцы. Ён цяжка і невылечна хварэў і ў 1780 г. скончыў жыццё самагубствам.

Сёння мы можам убачыць, як выглядала сядзіба Рэйтана тых часоў, на акварэлі Напалеона Орды. Калісьці дом быў каменным і аднапавярховым. Драўляны будынак з мансардным паверхам быў пабудаваны на старым фундаменце Юзафам Рэйтанам у канцы XIX ст. Упрыгожаннем інтэр'ера дома былі печы з галандскай кафлі, вінтавая чыгунная лесвіца, карцінная галерэя, паляўнічая зала і пакой ушанавання памяці Тадэвуша Рэйтана. У будынку былі водаправод, каналізацыя і электрычнасць.

Вялікі інтарэс выклікае фамільная капліца роду Рэйтанаў у неагатычным стылі. Сюды ў 1930 г. быў перанесены і прах Тадэвуша Рэйтана, які да гэтага спачываў у цагляным склепе – «хованцы пад грабам». Да капліцы вядзе алея з 24 лістоўніц. Яна ўяўляе сабой містычную лесвіцу ў неба. Сёння ўжо ніхто не ведае методыку, па якой падбіраліся па росце грушаўскія лістоўніцы.

На цяперашні час на тэрыторыі сядзібы захаваліся двухпавярховы дом, флігелі, бровар, лядоўня, стайні з чырвонай цэглы, капліца-пахавальня, парк рэгулярнай планіроўкі, у якім маюцца рэдкія для нашай мясцовасці пароды дрэў. Па ўспамінах Ганны Уладзіміраўны Сіцько (яна працавала ў маёнтку прыбіральшчыцай), нашчадкі Тадэвуша Рэйтана ніколі не пакідалі без увагі і клопату тых людзей, хто ў гэтым меў патрэбу.

Такім чынам, тэма краязнаўства і вывучэння гісторыі родных мясцін спрыяе зацікаўленасці да адкрыцця гісторыі ўсёй краіны, узбагачае наш унутраны свет і надае напрамкі да развіцця сучаснай беларускай культуры. У гэтым кантэксце істотае значэнне мае памяць пра Тадэвуша Рэйтана.